грамадства, у тым ліку і прыгожае пісьменства. Маладыя пісьменнікі, што далучыліся да мастацкай творчасці пасля рэвалюцыі, праходзілі перыяд творчага станаўлення ў атмасферы палемікі, спрэчак, перагляду літаратурнай і мастацкай спадчыны. Разам з тым, натхнёнасць, пасіянарнасць, упэўненасць ва ўласных сілах прымушалі верыць, што яны здольныя стварыць новае мастацтва, літаратуру, якіх яшчэ не існавала дагэтуль. Адсюль – і фармальныя пошукі і лозунгі накшталт "далоў класікаў", "у рожкі са старымі". Неабходна таксама ўлічваць і паскораны характар развіцця нацыянальнай літаратуры, што прымушала творцаў выпрабоўваць самыя розныя сродкі мастацкай выразнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя / І. Э. Багдановіч – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 387 с.

УДК 94 (47)

# ТРАГІЧНЫ ЛЁС ТЭАРЭТЫКА НЭПА МІКАЛАЯ ДЗМІТРЫЕВІЧА КАНДРАЦЬЕВА

Хаданёнак В.М., загадчык кафедры
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: новая эканамічная палітыка, тэорыя эканамічных цыклаў, эканамічная статыка і дынаміка, рэпрэсіі, рэабілітацыя, навуковая школа.

Рэферат. Артыкул прысвечаны разгляду пакручастага жыццёвага, навуковага і творчага шляху аднаго з самых выдатных вучоных-эканамістаў XX стагоддзя – Мікалая Дзмітрыевіча Кандрацьева.

Новая эканамічная палітыка і яе рэалізацыя на тэрыторыі савецкай Беларусі і Расіі заўжды прыцягвала да сябе пільную ўвагу навукоўцаў. Яна сапраўды была новай і шмат учым унікальнай з'явай, калі разглядаць яе ў агульным кантэксце эканамічных і палітычных мерапрыемстваў савецкай улады. Адным з асноўных яе тэарэтыкаў быў вядомы вучоны-эканаміст Мікалай Дзмітрыевіч Кандрацьеў. Барацьба з іншадумствам і пошук ворагаў ва ўсіх катэгорыях насельніцтва прывялі да зняволення, а затым і смяротнага пакарання аднаго з самых таленавітых эканамістаў XX стагоддзя.

Першая сусветная вайна (1914–1918 гг.) паклала пачатак працягламу сацыяльна-палітычнаму і эканамічнаму крызісу, які яшчэ больш узмацніўся з-за рэвалюцыйных падзей 1917 г. і грамадзянскай вайны. Адбываліся структурныя змены ў палітычным, эканамічным, культурным і грамадскім жыцці. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, за даволі НЭПрацяглы перыяд часу, была нацыяналізавана амаль ўся прамысловасць, апроч дробнай і саматужнай. Устанаўлівалася манаполія на пераважную большасць харчовых прадуктаў і сыравіны. Свабодныя рынкавыя адносіны сталі немагчымымі, а сістэма дзяржаўнага планавання і кіравання была строга цэнтралізавана. У 1922 г. пакупніцкая здольнасць рубля ў параўнанні з 1917 г. знізілася ў 74 разы [1, с. 347]. У 1922–1924 гг. інфляцыя дасягнула неверагодных маштабаў: у абарачэнні былі грашовыя купюры ў мільёны і мільярды рублёў [2, с. 246].

З 8 па 16 сакавіка 1921 г. у Маскве праходзіў X з'езд Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) [3, с. 5]. Менавіта ён стаў паваротным пунктам у пераходзе краіны да НЭПа. Новая эканамічная палітыка разглядалася ў першую чаргу як цыкл

мерапрыемстваў Савецкай дзяржавы па выхаду з крызісу [4, с. 330]. Планавалася ўмацаваць саюз рабочага класа і сялянства на эканамічнай аснове, развіваць прамысловасць на базе электрыфікацыі, актыўна ўкараняць таварна-грашовыя адносіны і гаспадарчы разлік, імкнуцца да павышэння асабістай зацікаўленасці людзей ў выніках сваёй працы, ажыццяўляць часовы допуск капіталістычных элементаў у эканоміку, удасканальваць дзяржаўнае планаванне і кіраванне, змагацца з бюракратызмам і адміністрацыйна-каманднымі звычкамі, а таксама павышаць узровень культуры ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці [4, с. 330–331]. Дэкларатыўна заяўлялася, што пры рэалізацыі новай эканамічнай палітыкі будуць абавязкова ўлічвацца спецыфічныя эканамічныя, сацыяльна-палітычныя, прыродныя і культурныя асаблівасці і адметнасці рэгіёнаў.

Вынікі рэалізацыі новай эканамічнай палітыкі і сапраўды ўражвалі. Удалося адрадзіць зруйнаваную войнамі гаспадарку, павысіць матэрыяльны дабрабыт насельніцтва, рубель (пасля паспяховага заканчэння грашовай рэформы) стаў цвёрдай канвертуемай валютай, сфарміравалася савецкая крэдытная сістэма, назіралася дэмакратызацыя эканамічнага жыцця краіны. Тым не менш, ужо ў 20-я гг. выявілася кардынальная супярэчнасць паміж эканамічным жыццём, якое развівалася на аснове дэмакратычнай новай эканамічнай палітыкі, і грамадска-палітычнай сістэмай дзяржавы, што ўсё больш набывала аўтарытарны характар [5, с. 261]. А новыя рэаліі, якія былі выкліканы да жыцця НЭПам, усё больш супярэчылі камуністычнай дактрыне, рэалізацыя якой адсоўвалася ў невядомую будучыню. Стала зразумелым, што жорсткая цэнтралізаваная сістэма, ядром якой была камуністычная партыя, не можа дзейнічаць ва ўмовах шматукладнасці,і непазбежна ўзнікшага плюралізму палітычных інтарэсаў, свабоднай гульні палітычных сіл, глебу для якіх стварыў НЭП [6, с. 43].

Бадай што адну з самых трагічных роляў у віхуры эканамічных і палітычных падзей 20–30-х гг. XX стагоддзя прыйшлося сыграць М. Дз. Кандрацьеву. Мікалай Дзмітрыевіч Кандрацьеў нарадзіўся ў сакавіку 1892 г. у вёсцы Галуеўская Кінешамскага павета Кастрамской вобласці (цяпер Іванаўская вобласць) [7, с. 136]. Ён быў старэйшым з 10 дзяцей і з маленства актыўна дапамагаў бацькам па гаспадарцы. У 1904 г. паступае ў Хрэноўскую царкоўна-настаўніцкую семінарыю, дзе пазнаёміўся і пасябраваў з Пiцiрымам Сарокіным [8, с. 78], шчырыя адносіны з якім захаваліся на ўсё жыццё. Паспяхова скончыць Хрэноўскую семінарыю не ўдалося, бо Мікалая Дзмітрыевіча выключылі адтуль за палітычную недобранадзейнасць і на непрацяглы час пасадзілі за краты. Пасля вызвалення ён едзе ў Санкт-Пецярбург, дзе вучыцца на агульнаадукацыйных Чарняеўскіх курсах, затым у прыватным псіханеўралагічным інстытуце і ў рэшце-рэшт заканчвае юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. За выключныя здольнасці да вучобы і навукі яго пакідаюць ва ўніверсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання на кафедры палітычнай эканоміі і статыстыкі.

Ужо ў 1915 г. М. Дз. Кандрацьеў выдае сваю першую манаграфію “Развитие хозяйства Кинешемского земства Костромской губернии (социально-экономический и финансовый очерк)”, дзе дэталёва аналізуе гаспадарча-фінансавае становішча рэгіёна [9, с. 146]. Але рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. не дазваляюць яму цалкам засяродзіцца на навуковай працы. Ён стаў сакратаром Аляксандра Фёдаравіча Керанскага па справах сельскай гаспадаркі, удзельнічаў ў якасці дэлегата на III з’ездзе партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), актыўна працаваў у Лізе аграрных рэформ і Галоўным зямельным камітэце, быў абраны ў Часовы савет Расійскай рэспублікі і прызначаны таварышам міністра харчавання Часовага ўрада [8, с. 81–82].

У 1918 г. М. Дз. Кандрацьеў пераязджае з Петраграда ў Маскву і пачынае выкладчыцкую дзейнасць у кааператыўным інстытуце. А з 1920 г. становіцца адным з заснавальнікаў і першым дырэктарам Кан’юнктурнага інстытута. Менавіта на гады НЭПа прыходзіцца росквіт выкладчыцкай, навуковай і дзяржаўнай дзейнасці Мікалая

Дзмітрыевіча. У 1922 г. выходзіць яго работа "Мировое хозяйство и его конъюнктуры во время и после войны" [10]. З яго імем знітаваны капітальныя даследаванні ў галіне тэорыі кан'юнктуры, заканамернасцяў і паказчыкаў яе дынамікі, абгрунтаванне доўгіх хваляў эканамічнай кан'юнктуры. Мікалай Дзмітрыевіч друкаваў работы і па пытаннях прагназавання і перспектыўнага планавання, па аграрных праблемах, статыстыцы і інш. [11, с. 5].

У 1924 г. М. Дз. Кандрацьеў адпраўляецца ў працяглую навуковую паездку за мяжу. Ён наведвае Злучаныя Штаты Амерыкі, Велікабрытанію, Канаду, Германію з мэтай вывучыць арганізацыю сельскагаспадарчай вытворчасці ў развітых капіталістычных краінах і азнаёміцца з метадамі ўздзеяння на яе з боку дзяржавы [8, с. 84]. Піцірым Сарокін, на той перыяд часу ўжо сусветнавядомы сацыёлаг, прапаноўваў Кандрацьеву застацца ў ЗША і ўзначаліць адну з кафедр пры ўніверсітэце, але Мікалай Дзмітрыевіч адмовіўся.

Пасля вяртання з-за мяжы М. Дз. Кандрацьеў працягвае сваю актыўную працу ў галіне планавання. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам быў распрацаваны перспектыўны план развіцця сельскай і лясной гаспадаркі РСФСР на 1923–1928 гг. [8, с. 85]. Ён дазволіў сялянам адчуць часовае паслабленне паміж харчразвёрсткай перыяду ваеннага камунізма і суцэльнай калектывізацыяй.

Мікалай Дзмітрыевіч становіцца вучоным, якога добра ведаюць не толькі на Радзіме, але і ва ўсім свеце. Даследаванне ім заканамернасцяў цыклічнага развіцця эканамічнай кан'юнктуры становіцца метадалагічнай асновай для аналіза праблемаў цыклічнасці не толькі на агульнагаспадарчым, але і на галіновым узроўні [12, с. 93]. Ён становіцца сябрам Амерыканскай акадэміі сацыяльных навук, Лонданскага статыстычнага таварыства, Амерыканскай асацыяцыі па пытаннях сельскагаспадарчай эканомікі, Амерыканскай эканамічнай асацыяцыі і інш. [8, с. 77]. Але неўзабаве навуковыя і творчыя поспехі М. Дз. Кандрацьева трагічным чынам перарваліся яго арыштам.

Масавыя рэпрэсіі адмоўна адбіліся на развіцці многіх галін навук. Так у БССР былі зачынены інстытуты філасофіі і савецкага будаўніцтва, фізіка-тэхнічны інстытут, таму што там фактычна не засталося супрацоўнікаў. А абяскроўлены інстытут эканомікі (у 1936–1938 гг. былі арыштаваны 9 супрацоўнікаў інстытута) быў перададзены пад апеку Дзяржплана БССР [13, с. 12]. Сітуацыя з навуковымі кадрамі ў СССР была рыхт у рыхт такая ж. За кароткі прамежак часу былі расстраляны сотні акадэмікаў і дактароў навук: Я. М. Афанасьеў, В. І. Бажэнаў, У. М. Бенашэвіч, П. І. Бутаў, В. Р. Глушкоў, У. С. Ігнатоўскі, Р. А. Ільінскі, В. В. Асінскі, А. М. Самайловіч, А. А. Саткевіч і многія іншыя.

Над Мікалаем Дзмітрыевічам згушчаліся хмары. У газеце "Известия" у раздзеле "Хроніка" 3 верасня 1930 г. дробным шрыфтам было надрукавана наступнае паведамленне "ОГПУ арестованы: Кондратьев Н.Д. Громан В.Г., Садырин П.А., Чаянов А.В., Юровский Л. Н., Суханов Н.Н., Рамзин Л.К., Базаров В.А. и другие как участники и руководители контрреволюционных организаций, поставивших целью свержение советской власти и восстановление власти помещиков и капиталистов" [14, с. 30]. Справу супраць "небяспечных злачынцаў" курыраваў непасрэдна Іосіф Сталін. У лісце да старшыні Савета народных камісараў СССР Вячаслава Молатава ён катэгарычна зазначае "Кондратьева, Громана и пару другую мерзавцев нужно обязательно расстрелять" [14, с. 31], а ў лісце да старшыні АДПУ В. Р. Менжынскага ўвогуле прапануе "провести сквозь строй гг. Кондратьева, Юровского, Чаянова и т.д., хитро увиливающих от "тенденции к интервенции"" [14, с. 321–322]. Па непасрэднаму даручэнню Сталіна да Мікалая Дзмітрыевіча прымяняліся фізічныя катаванні.

Усе жудасныя выпрабаванні не зламілі духу М. Дз. Кандрацьева. Знаходзячыся ў вязніцы ён працягваў пісаць навуковыя работы, у прыватнасці "Основные проблемы

экономической статики и динамики", якая ўбачыць свет толькі ў 1991 г. Асаблівай увагі заслугоўваюць яго лісты да жонкі і вершаваная філасофская казка для сваёй дачкі Алены "Необыкновенные приключения Шамми".

8 гадоў М. Дз. Кандрацьеў правёў у палітычным ізалятары суздальскай турмы. Прыгавор аб яго смяротным пакаранні падпісалі асабіста І. Сталін і В. Молатаў 17 верасня 1938 г. У гэты ж дзень Мікалай Дзмітрыевіч быў расстраляны на палігоне "Камунарка"на 24-м кіламетры Калужскай шашы ў Маскоўскай вобласці.

Поўная рэабілітацыя Кандрацьева адбылася толькі ў 1987 г., а праз 50 гадоў пасля яго смерці, нарэшце ўбачылі свет невядомыя работы і лісты Мікалая Дзмітрыевіча, якія самаахвярна захоўвалі і зберагглі яго жонка і дачка [8, с. 76]. У 1992 г. быў створаны міжнародны фонд М. Дз. Кандрацьева, а адмысловая камісія па вывучэнню яго навуковай спадчыны спрычынілася да выдання работ вядомага вучонага: "Проблемы экономической динамики", "Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции", "Большие циклы конъюнктуры и теория предвидения", "Сказка о Шамми и письма к Алёнушке из суздальской тюрьмы" і інш.

Тэарэтычная і метадычная спадчына М. Дз. Кандрацьева атрымала сваё заканамернае развіццё ў навуковых выніках розных накірункаў і школ сучаснай эканамічнай думкі, у прыватнасці Ю. У. Якаўца, А. І. Субетта, В. Ц. Разанава, С. В. Дубоўскага, С. Ю. Глазьева, Г. Менша, А. Клейнкнехта, Дж. Форрэстэра, Г. Сілверберга і інш. [15, с. 8]. На пастаяннай аснове праводзяцца міжнародныя круглыя сталы, канферэнцыі і чытанні, прысвечаныя М. Дз. Кандрацьеву, а раз на тры гады вядомыя вучоныя Расіі ўзнагароджваюцца залатым, срэбраным і бронзавым медалём з яго імем.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Протько, Т. С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т. С. Протько. – Минск : Тесей, 2002. – 688 с.
2. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : "Энцыклапедыкс", 2003. – 490 с.
3. Десятый съезд РКП(б). Март 1921 г.: Протоколы. – М.: Партиздат, 1933. – 954 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 5 : М – Пуд. – 1999. – 592 с.
5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
6. Вішнеўскі, А. Ф. Асаблівасці палітыка-прававога рэжыму савецкай дзяржавы і яго вытокі (1917–1953 гг.) / А. Ф. Вішнеўскі. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Тэсей, 2006. – 328 с.
7. Баутин, М. В. Николай Дмитриевич Кондратьев и его роль в становлении агроэкономической науки и образования в России / М. В. Баутин // Известия ТСХА. – 2017. – Вып. 2. – С. 134–153.
8. Агеев, А.И. Сорокин и Кондратьев – два переплетённых пути / А. И. Агеев, Б. А. Мясоедов // Экономические стратегии. – 2013. – № 5. – С. 76–87.
9. Болсун, Г. А. Образовательный уровень промышленных рабочих Верхнего Поволжья в конце XIX – начале XX в. / Г. А. Болсун // Российские и славянские исследования : Сб. науч. статей. Вып. 1 / Редкол.: О. А. Яновский (отв. ред.) и др. – Мн. : БГУ, 2004. – С. 143–148.

10. Кондратьев, Н. Д. Мировое хозяйство и его конъюнктуры во время и после войны / Н. Д. Кондратьев. – Вологда, 1922. – 258 с.

11. Большие циклы конъюнктуры и теория предвидения / Н. Д. Кондратьев; Междунар. фонд Н. Д. Кондратьева [и др.]. – М. : Экономика, 2002. – 765, [2] с.

12. Гайсин, Р. С. Долгосрочные циклы конъюнктуры агропродовольственного рынка / Р. С. Гайсин // Научное наследие Н. Д. Кондратьева и современность: X Международная Кондратьевская конференция 25–30 сентября 2017 г.: сборник тезисов докладов и выступлений участников Конференции. – Москва – Волгоград, 2017. – 416 с.

13. Возвращенные имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталин. репрессий / сост. и авт. предисл. Н. В. Токарев; под ред. А. С. Махнача. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 120 с.

14. Ясный, Н. Советсие экономисты 1920-х гг. Долг памяти / Н. Ясный. – М.: Издательский дом “Дело”, 2012. – 344 с.

15. Фомина, А. В. Циклы Кондратьева в экономике России / А. В. Фомина. – М., 2005. – 146 с.

УДК 94(476):339

## НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА І АСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Ходзін С.М., загадчык кафедры
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Ключавыя словы: новая эканамічная палітыка, мадэрнізацыя, дзяржаўныя інстытуты.

Рэферат. Артыкул прысвечаны аналізу нацыянальнай мадэрнізацыі ў Беларусі ў перыяд новай эканамічнай палітыкі.

Змест эканамічнай палітыкі – гэта, найперш за ўсё, дзейнасць дзяржавы, ступень яго ўмяшання ў ажыццяўленне эканамічных працэсаў. Ужо ў 1920-я гг. у сусветнай практыцы вызначылася неабходнасць комплекса дзяржаўных мерапрыемстваў, які з цягам часу даследчыкі абагульнілі пад назвай «эканамічная палітыка». Па сутнасці, гэта паводзіны дзяржавы ў эканоміцы як выяўленне сукупнай волі грамадства праз рашэнні і дзеянні урада. Эканамічная палітыка акрэсліваецца праз вызначэнне прававых норм, уздзеянне на гаспадарчыя працэсы, выкарыстанне дасягненняў навукі. Пры гэтым, асабліва істотным на этапе пераходу ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага, з’яўляецца ўлік прыродна-кліматычнага і дэмаграфічнага (рэсурснага) фактараў, асаблівасцяў гістарычнага развіцця і фактару сацыяльнай псіхалогіі насельніцтва, што выяўляецца ў сістэме эканамічных паводзін суб’екта гаспадарання. Істотнае значэнне мае наяўнасць шырокага ці абмежаванага гістарычнага вопыту.

Магчымасці выпрацоўкі і рэалізацыі нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі, перадумовы якой фарміруюцца з 1921 г., залежалі найперш ад развіцця дзяржаўных інстытутаў Беларусі [1, с. 39–40]. Частка яе тэрыторыі апынулася пад уладай Польшчы, а савецкая была падзелена паміж БССР, адроджанай першапачаткова ў межах 6 паветаў былой Мінскай губерні, і Расійскай Федэрацыяй. Умовы развіцця гэтых тэрыторый складваліся па-рознаму. Фарміраванне і рэалізацыя агульнадзяржаўнай палітыкі ўскладняліся не толькі падзеленасцю тэрыторыі Беларусі, але і ўнутрыпалітычнай